# Калейдаскоп колераў і настрояў

## Парадаксальнасць вобразаў у работах Марыі Пяшкун

Творчасць Марыі Пяшкун — гэта сакавітая палітра тыпажоў і тыпаў, шырокі спектр эмоцый і пачуццяў, стракаты яркі калейдаскоп настрояў. Мастачка захоўвае на палатне і паперы як рэальных людзей, так і зборныя вобразы, выдуманых герояў, персанажаў казак, міфаў, фантазій і сноў. Ёй усяго 17 гадоў, але ж гэта не перашкаджае мастачцы паўнавартасна аддавацца творчасці. Зусім нядаўна ў Мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» ў Мінску адкрылась другая персанальная выстаўка Марыі «Хаос маіх думак», дзе аўтар прадставіла работы, якія, па яе меркаванні, дэманструюць формулу асабістых змен у творчасці. У экспазіцыі прадстаўлены жывапіс, графіка, накіды і некалькі работ у тэхніцы «ляўкас».

Назва экспазіцыі выдатна адлюстроўвае сутнасць работ аўтара. У фантастычных і казачных вобразах пераважаюць яркія і насычаныя колеры. На палатне быццам бы звыклыя чалавеку вобразы скажаюцца да непазнавальнасці. Частым прыём мастачкі — выкарыстанне гульні слоў у назвах твораў для стварэння парадаксальнага вобраза. Напрыклад, карціна пад назвай «Ікона стылю». Як адзначае сама Марыя Пяшкун, на гэтай выстаўцы сабраны найлепшыя яе работы. Прычым яны даволі разнастайныя. Марыя з сям'і мастакоў, але мае свой арыгінальны почырк. Часта сутыкаецца з крытыкай, аднак усе роўна працягвае ісці наперад і развівацца.

— Вядома, у маіх работах ёсць пэўнае падабенства з творчасцю бацькоў. Бо я ж з імі заўсёды побач, бачу, як яны малююць, чым захапляюцца, — расказала Марыя Пяшкун. — Я заўсёды назіраю за імі, падкрэсліваю, якія мне падабаюцца дэталі жывапісу, што ў іх цікавага. У мяне не было мары або жадання працягнуць справу сям'і, усё атрымалася само сабой. Зараз я, напрыклад, стараюся ў прынцыпе не глядзець на работы мамы і таты, а вывучаю ўвесь свет мастацтва. Мне падабаецца *modern-art*, у яго апошнім часам і паглыбляюся.

Чым цікавая творчасць Марыі, дык гэта пабудовай мастацкіх метафар і фарміраваннем унўтранных стратэгій твораў. Напрыклад, на выстаўцы можна ўбачыць аўтапартрэты мастачкі, створаныя на выкарыстанні процілегласці. Адзін аўтапартрэт пабудаваны як эстэтычнае фота: прыгожы сілуэт, вытанчаныя лініі твару, ідэальна пастаўлены ракурс. Другі паказвае адваротны бок, праз які разбураюцца ўсе стэрэатыпы папярэдняга кадра.

— Мне падабаецца шукаць розныя стылі. І я не ўяўляю сябе мастаком без далейшага развіцця, — дзеліцца аўтар. — Можна вывучаць гістарычны аспект, можна паралельна шукаць актуальныя напрамкі ў сучаснай арт-прасторы. Напэўна, галоўнае — быць рухомым, не ленавацца. Сёння я дакладна ведаю, што мяне чапляюць яркія работы, у якіх не проста майстэрства мастака, а гісторыя, глыбокія перажыванні, спантанная думка.




«Мой фетиш». 2019 г.

Адрознівае стыль Марыі Пяшкун здольнасць ствараць колеравы настрой. Як гэта? Насамрэч, усё даволі проста: па пэўным колеры можна зразумець, пра што кажа мастачка. Увогуле, ёсць адчуванне, што сама маладосць аўтара дае запал яе работам. Яны энергічныя, эмацыянальныя. Галоўнае, што ў іх няма абыякавасці альбо проста жадання эксперыментаваць. Марыя сапраўды стварае жыццё ў сваіх творах.

Сёння аўтар вучыцца ў каледжы мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка. Шмат чытае і малюе і ў будучыні жадае развіваць свае здольнасці. Мастачка ўжо ўдзельнічала ў пленэрах «У пошуках Атлантыды» і пленэры імя Язэпа Драздовіча. Работы яе выстаўляліся ў межах міжнародных праектаў у Расіі, Кітаі, Танзаніі, Іспаніі, а карціны былі набыты *Caso de los gatos* museo (Ларэта-дэ-Мар, Іспанія). У Беларусі Марыя неаднаразова прымала ўдзел у выстаўках «Панна DOLL'я» у Мінску, Віцебску, Брэсце, Азярцы і Лепелі. У 2015 ў кавярні «*CoolCoffee*» прайшоў паказ яе карцін пад назвай «Машанька і мядзведзі», а у 2018 адбылася першая персанальная выстаўка ў салоне «Грай кафэ».

**Вікторыя АСКЕРА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ